# Весці

## БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**№ 4 (30) 2001**

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

## ЗМЕСТ

***Галоўны рэдактар:***
Л. Н. Ціханаў

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Н. І. Копысава (*адказны сакратар*)
Г. А. Космач
І. А. Новік
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

*Педагогіка*

*Цімашкова Л. М.* Рэфлексіўна-дзейнасны падыход у вывучэнні педагагічных дысцыплін як умова фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці будучых настаўнікаў............3
*Каравай І. У.* Вопыт арганізацыі вучэбна-творчай дзейнасці студэнтаў у працэсе вывучэння педагагічных дысцыплін ........10
*Скорыкава А. І.* Камп'ютэрныя тэхналогіі як сродак фарміравання духоўнага свету асобы вучня..............................19
*Сярнова Т. В.* З вопыту вакальнай работы са студэнтамі прафесара Т. М. Ніжнікавай..............................................25
*Лихачева С. Н.* Особенности социального становления выпускников интернатских учреждений...................................30
*Асавнок И. С., Жалковский В. И.* Особенности организации научно-исследовательской работы студентов на непрофилирующей кафедре..............................................33

*Псіхалогія*

*Мышко О. П.* Структура и виды речевой деятельности.........36
*Шлыкова Т. Ю.* Осознание подростками причин успехов и неудач и его роль в формировании личности ..........43

*Дэфекталогія*

*Гіруцкі І. А.* Псіхалагічныя асаблівасці моўнага мыслення і яго спецыфіка ў дзяцей з першаснай інтэлектуальнай недастатковасцю..............................................................50

*Мовазнаўства*

*Урбан В. В.* Асаблівасці семантыкі ацэначнай лексікі ..........55
*Слабко І. У.* Мадэлі і варыянты камбінаваных сінтаксічных канструкцый..............................................59
*Курилова Л. Н.* Ударение в предложно-именных формах......63
*Портнова А. В.* Вопросы исторической лексикологии в восточнославянской лингвистической литературе XIX—XX вв. (аспекты изучения абстрактной лексики)....................70

*Сацыялогія*

*Зенчанка В. А.* Працэсы трансфармацыі ў сучасным беларускім грамадстве і праблемы фарміравання палітычнай культуры моладзі..............................................78

# САЦЫЯЛОГІЯ

УДК 316.346.32-053.6

*В. А. Зенчанка*

## ПРАЦЭСЫ ТРАНСФАРМАЦЫІ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ І ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ ПАЛІТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ МОЛАДЗ

У сучасным свеце адбываюцца шырокамаштабныя тра фармацыйныя працэсы, якія ахопліваюць усе сферы жыццяд насці грамадства: палітычную сістэму, эканоміку, сацыяль структуру, духоўнае жыццё. Яны маюць розны змест і спецыф ныя аспекты ў развітых краінах Захаду, у постсацыялістыч дзяржавах, у так званых краінах «трэцяга свету», у розных ра ёнах зямнога шара. Не абышлі яны і Рэспубліку Беларусь.

Значныя змены, якія адбываюцца ў беларускім грамадст як і на ўсёй постсавецкай прасторы, патрабуюць глыбокага ас савання і пераасэнсавання.

Працэсы трансфармацыі (італ. *transformare* — пераўтвара у нашай краіне можна вызначыць як сістэмныя, якія закра юць усе сферы грамадскага жыцця. Пры гэтым трэба мець ўвазе, што ў адрозненне ад рэформ і мадэрнізацыі сістэм трансфармацыя прадугледжвае ўсебаковае пераўтварэнне грама скіх адносін, якое прыводзіць да стварэння новай мадэлі грама скага развіцця.

Сутнасць гэтых пераўтварэнняў коратка можна звесці да ступнага. У палітычнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь адбы пераход ад манаполіі на ўладу адной партыі да палітычнага пл ралізму, шматпартыйнасці, парламентарызму. У сферы эканом кі ажыццяўляецца пераход ад цэнтралізаванай планавай эка мікі да эканамічнай сістэмы рынкавага тыпу. Эканамічныя п раўтварэнні прыводзяць да змен у становішчы і ролі класаў і с цыяльных груп у сацыяльнай структуры грамадства, з'яўлен новых сацыяльных слаёў: прадпрымальнікаў, фермераў і ін Глыбокія змены назіраюцца і ў духоўна-культурных арыенці грамадскага развіцця.

Такім чынам, становіцца відавочнай пільная неабходнас аб'ектыўным навуковым аналізе і ацэнцы ўздзеяння гэты пераўтварэнняў на палітычную культуру як грамадства ў цэлы

слаення, рост патэнцыяльных магчымасцяў павышэння жыццёвага ўзроўню і падзенне рэальнага ўзроўню прыбыткаў, асабліва сярод моладзі, скарачэнне патрэбнасці ў працоўнай сіле, неўпэўненасць у заўтрашнім дні і бесперспектыўнасць спараджаюць, з аднаго боку, песімізм, апатыю, а з другога — рост радыкальных, экстрэмісцкіх настрояў сярод значнай часткі моладзі і тым самым значна ўскладняюць працэс яе сацыялізацыі і фарміравання па-сапраўднаму дэмакратычнай палітычнай культуры.

Па-другое, пераход грамадства з аднаго якаснага стану ў другі суправаджаецца не толькі карэнным пераўтварэннем сацыяльна-эканамічных і палітычных адносін і інстытутаў, але і балючай і супярэчлівай ломкай светапоглядных асноў грамадства, былой сістэмы каштоўнасцяў, арыентацый, установак, норм і ідэалаў. Асабліва ў складанай сітуацыі аказваецца моладзь, якая ў дастатковай ступені яшчэ не асвоіла ніякай сістэмы каштоўнасцяў: старая разбурана, а новая не сфарміравалася (яе фарміраванне і асваенне патрабуе доўгага часу). У выніку гэта прыводзіць да экзістэнцыяльнага і светапогляднага вакуума, нігілізму, палітычнасці.

Па-трэцяе, такія ўзроставыя асаблівасці моладзі, як адсутнасць жыццёвага і палітычнага вопыту, стойкіх перакананняў і каштоўнасных арыентацый, максімалізм, даверлівасць дазваляюць розным палітычным сілам маніпуляваць свядомасцю і паводзінамі маладых людзей. Тут спрацоўвае, па трапным выразе вядомага расійскага вучонага і палітыка Г. Х. Папова, эфект «поўнага плюралізму ў адной галаве».

Сацыялагічныя даследаванні, якія былі праведзены ў шэрагу ВНУ рэспублікі, сведчаць, што нават студэнцтва, якое прадстаўляе сабой найбольш адукаваную і інтэлектуальна развітую частку моладзі, валодае недастаткова высокім узроўнем палітычных ведаў і палітычнай культуры, неглыбокім разуменнем палітычных працэсаў, якія адбываюцца ў свеце і ў нашай краіне.

Праведзеныя апытанні дазваляюць падзяліць усіх рэспандэнтаў у залежнасці ад узроўню палітычных ведаў на тры ўмоўныя групы:

1) з высокім узроўнем палітычных ведаў — 8,3 %;
2) з сярэднім узроўнем — 21,60 %;
3) з нізкім — 70,1 %.

Узровень палітычнай дасведчанасці сярод рабочай і сялянскай моладзі яшчэ ніжэй. Сацыялагічныя даследаванні сведчаць не толькі аб слабым інтарэсе да палітыкі, але і аб палітычнай пасіўнасці, адхіленасці ад непасрэднага ўдзелу ў палітычным жыцці грамадства абсалютнай большасці маладых людзей. Так, толькі больш за 2 % маладых людзей прымае рэальны ўдзел у рабоце палітычных і іншых арганізацый. Ад 92 да 94,7 %

розных сацыяльна-прафесійных груп моладзі не з'яўляюцца і не імкнуцца стаць прыхільнікамі альбо членамі палітычных партый [2, с. 38].

Сярод значнай часткі моладзі назіраецца сур'ёзная дэвальвацыя такіх паняццяў, як патрыятызм, грамадзянскасць, сацыяльная адказнасць. Па даных сацыяльна-палітычнага маніторынга, які быў праведзены ІСПД пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у школе рэйтынга найбольш значных каштоўнасцяў апошнія месцы займаюць Айчына (47 %), патрыятызм (27,5 %), армія (15 %). Толькі 12,9 % апытаных у якасці найбольш важных каштоўнасцяў выбралі пачуццё грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, толькі 6,9 % ганарацца сваёй краінай, кожны 10-ы малады чалавек марыць выехаць за мяжу, 8,6 % моладзі гатовы прыняць удзел у несанкцыянаваных мітынгах і дэманстрацыях, 11 % — у забастоўках, 13,4 % — у мітынгах пратэсту, 4,9 % — ва ўзброеных выступленнях. Гэтыя лічбы значна вышэй, чым у больш сталых узроставых групах [3, с. 168—168].

Атрыманыя даныя пацвярджаюць нездавальняючы стан такой важнай кампаненты сацыялізацыі маладога пакалення, як фарміраванне палітычнай культуры. Між тым палітычная культура моладзі — гэта спосаб пераўтварэння падрастаючага пакалення ў паўнацэнных членаў грамадска-палітычнай структуры дзяржавы, фарміравання грамадзянскіх пазіцый і стойкіх перакананняў, што мае важнае значэнне для стабільнасці грамадства, яго паступовага і дынамічнага развіцця, асабліва ва ўмовах трансфармацыі.

Зыходзячы з выкладзенага, можна зрабіць вывад, што ў складаных і супярэчлівых умовах пераходнага грамадства моладзь мае патрэбу ў дакладных маральных арыенцірах, у пазітыўных сацыяльных ідэалах. Неабходна пастаянная пільная ўвага з боку дзяржавы да маладзёжных праблем, да вырашэння ідэалагічных, духоўна-маральных задач, якія звязаны з фарміраваннем актыўнай жыццёвай пазіцыі маладога пакалення, дэмакратычнай культуры.

Фарміраванне палітычнай культуры моладзі — даволі тонкі і працаёмкі працэс, які патрабуе глыбокіх ведаў псіхалогіі, інтарэсаў, імкненняў і патрэбнасцяў маладых людзей. Ён прадугледжвае павышэнне ўзроўню палітычнай інфармаванасці моладзі, выпрацоўку навыкаў і ўмення аналізаваць канкрэтную палітычную сітуацыю, прымаць правільныя, рацыянальныя рашэнні, далучэнне яе да грамадска-палітычнай дзейнасці, здольнасць адаптавацца да ўстаноўленых норм і ўзораў палітычных паводзін і іншых рэалій цывілізаванага палітычнага жыцця.

якая выпрацоўвае сукупнасць мэт, каштоўнасцяў і арыенціраў, да якіх могуць апеляваць індывіды і якія прыдаюць ім сэнс жыцця. Яна датэрмінуе светапогляд, перакананні, устаноўкі свядомасці і рэгулятывы паводзін асобы. Менавіта таму важна наяўнасць дзяржаўнай ідэалогіі, якая дазваляе аптымізаваць працэс фарміравання палітычнай культуры маладога пакалення.

Зараз моладзь арыентуецца на актыўны і дзейсны ўдзел у рэфармаванні грамадства. Ажыццяўленне гэтай задачы ў значнай ступені залежыць ад стварэння ў краіне эфектыўнай і аптымальнай сістэмы фарміравання яе палітычнай культуры.

### ЛІТАРАТУРА

1. *Местовский Н. А.* Состояние политической культуры студенческой молодежи в современном трансформирующемся обществе // Социология. 2000. № 2.
2. *Бабосов Е.* Молодежь Беларуси на пороге XXI века // Беларуская думка. 1999. № 6.
3. *Назаренко Л. Е., Маслова И. И.* О жизненных ориентациях современной молодежи // Экономика и право переходного периода: Материалы IV Междунар. конф. Гродно, 2000.

### SUMMARY

*Transformation processes in modern Belarus society and problems of political youth culture. Main social and economical, political and psychological factors which influence the process of political youth culture formation under the conditions of belarussian society systematical transformation are analyzed. Some ways and means of this process optimization to formate political youth culture are underlined.*

УДК 316.346.32-053.6(476)

*Э. Р. Іофе*

## ДА ПЫТАННЯ АБ ПАВЫШЭННІ САЦЫЯЛЬНАГА СТАТУСУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Тэрмін «сацыяльны статус» у нашы дні мае дваякі сэнс. Па-першае, гэта суадносная пазіцыя індывіда або сацыяльнай групы, якая вызначаецца сацыяльнымі прыкметамі (эканамічнае становішча, прафесія, кваліфікацыя, адукацыя і да т. п.), прыроднымі прыкметамі (пол, узрост і г. д.), а таксама прэстыжам месцам у структуры ўлады. Па-другое, гэта сукупнасць правоў і абавязкаў індывіда або сацыяльнай групы, якая звязана з выкананнем імі пэўнай сацыяльнай ролі.